NEWSLETTER BELARUS Live www.Belarus-Live.eu 07.11.2008 — 13.11.2008

Сорас прапануе даць Лукашэнку шанец

Справу Пісальніка пакінулі без разгляду

Эўрапейская кааліцыя хоча зьменаў у АДС

Латвія — за Беларусь

На XI Менскім форуме прагучыць тэма свабоды СМІ

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны па-слуцку

Усясьветны фінансавы крызыс пакрысе пачынае ўплываць і на Беларусь. Першымі гэта канстатавалі незалежныя эксПэрты, а цяпер асьцярожна прызнаюць ужо і чыноўнікі.

Шэраг беларускіх банкаў прыпыніў на няпэўны час выдачу крэдытаў, а тыя банкі, што працягваюць выдаваць крэдыты, падвысілі пры гэтым стаўкі, паведамляе рэсурс InfoBank.by.

Кіраўніцтва краіны засьцерагаецца панікі насельніцтва і робіць захады дзеля павышэньня ступені гарантаванасьці банкаўскіх унёскаў. Таксама становяцца болей выгаднымі ўмовы дэпазытаў, хаця падвышэньне працэнтных ставак не пасьпявае за ростам інфляцыі, якая па выніках году можа скласьці, паводле афіцыйных заяў, 14% (незалежныя эканамісты прагназуюць 20%).

Падтрымаць беларускую фінансавую сыстэму ў гэтых умовах можа расейскі крэдыт. 13 лістапада бакі падпісалі пагадненьне пра даваньне Беларусі крэдыту на два мільярды даляраў. Як чакаецца, першы мільярд краіна атрымае неўзабаве, а другі — на пачатку 2009 году.



photo.bymedia.net

Незалежныя экспэрты зьвяртаюць увагу на тое, што Масква пры гэтым вылучае ўмову: прыняць плян супольных дзеяньняў, датычны, у прыватнасьці, стварэньня адзінай валюты. Увядзеньне расейскага рубля ў якасьці такой валюты можа дэ-факта пазбавіць Беларусь часткі сувэрэнітэту.

Паралельна Менск вядзе перамовы зь Міжнародным валютным фондам пра атрыманьне крэдыту таксама на два мільярды даляраў. МВФ пакуль што не прыняў рашэньня. На думку незалежнага эканаміста Яраслава Раманчука, шанцы атрымаць гэты крэдыт у беларускага ўраду дастаткова высокія. Са свайго боку, фінансавы экспэрт Станіслаў Багданкевіч мяркуе, што супраца з МВФ можа стымуляваць рынкавую трансфармацыю беларускай эканомікі.

Ацэньваючы пэрспэктывы ўплыву ўсясьветнага фінансавага крызысу на сытуацыю ў Беларусі,

Станіслаў Багданкевіч у інтэрвію “Радыё Свабода” сказаў: “Цягам найбліжэйшага паўгоду абвальны крызыс Беларусь абміне, бо ёсьць свабодныя грошы на рахунку Мінфіну, прафіцыт бюджэту за дзевяць месяцаў — тры трыльёны рублёў і ёсьць крэдыты, якія дае Расея, а магчыма, дасьць і МВФ. Таму з дапамогай такіх крокаў Беларусь не абваліцца за шэсьць месяцаў. Іншае пытаньне, што ў далейшым дэвальвацыя рубля беларускага – будзе, бо дэфіцыт гандлёвага балянсу вялікі, а пры дэфіцыце заўсёды адбываецца дэвальвацыя нацыянальнай валюты, гэта ўжо закон эканамічнай тэорыі”.

Незалежны эканаміст, кіраўнік аналітычнага цэнтру “Стратэгія” Леанід Заіка таксама робіць выснову, што ў Беларусі адбудзецца дэвальвацыя, прычым яна можа быць дастаткова сур’ёзнай. Цалкам магчыма, што ўжо ў 2009 годзе курс даляра можа скласьці 2400, а потым — і 3000 беларускіх рублёў (на 13 лістапада ён складаў Br2132). “Так што варта чакаць падзеньня заробкаў ды іншых даходаў у даляравым эквіваленце”, — адзначае экспэрт.

Між тым дагэтуль менавіта паступальны рост заробкаў у пераліку на даляры быў прапагандысцкім фэтышам уладаў. Пагаршэньне



photo.bymedia.net

фінансава-эканамічнай сытуацыі змушае беларускае кіраўніцтва дэкляраваць лібэралізацыю эканомікі, рабіць захады дзеля стварэньня болей спрыяльнага інвэстыцыйнага клімату.

Менск усё болей зацікаўлены ў прыцягненьні інвэстыцый ды тэхналёгій і таму працягвае дэманстраваць сваё жаданьне нармалізаваць дачыненьні з Захадам.

Так, прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка ў гутарцы з карэспандэнтам амэрыканскай газэты “The Wall Street Journal” 11 лістапада выказаў зацікаўленасьць у наладжваньні дыялёгу з ЗША. Ён лічыць, аднак, што “ўсё залежыць ад Амэрыкі. Калі Амэрыка зацікаўленая ў разьвіцьці з намі стасункаў без выбудоўваньня нейкіх дадатковых бар’ераў і папярэдніх умоваў, то мы сур’ёзна ў гэтым пляне прасунемся”.

Тым часам Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу зацьвердзіла склады дэлегацый па супрацоўніцтве з ПА АБСЭ, ажыцьцяўленьні кантактаў з ПАРЭ, ПА НАТО, Паўночнай Радай ды іншымі міжнароднымі арганізацыямі. Пры гэтым старшыня міжнароднай камісіі ніжняй палаты Сяргей Маскевіч адзначыў, што “эўрапейскі складнік ёсьць важным аспэктам дзейнасьці беларускага парлямэнту”. Ён таксама падкрэсьліў, што “праводзіцца курс на прагматычную супрацу з ПА АБСЭ”, а “размарожваньне дачыненьняў з Парлямэнцкай асамблеяй Рады Эўропы ёсьць найважнейшай задачай на найбліжэйшую пэрспэктыву”.

Каб скрануць гэтыя стасункі зь мёртвага пункту, адзначаюць незалежныя экспэрты, трэба найперш выканаць мінімум патрабаваньняў, якія вылучае Эўропа, у прыватнасьці, рэальна ўзмацніць паўнамоцтвы парлямэнту. “Гэта ўсё будзе залежаць ня столькі ад саміх парлямэнтароў, паколькі яны, шчыра кажучы, мала што вырашаюць, колькі ад волі і жаданьня высокага кіраўніцтва”, — адзначыў у інтэрвію “Нямецкай хвалі” палітоляг Аляксандар Класкоўскі. На яго думку, “найвышэйшае кіраўніцтва будзе старацца калі і зрабіць у гэтым кірунку нейкія зрухі, то мінімальныя, дэкаратыўныя, таму што яно не зацікаўленае рэальна ствараць сабе процівагу ў выглядзе заканадаўчай галіны ўлады”.

13 лістапада на адкрыцьці XI Менскага форуму “Суседзтва і бясьпека: пэрспэктывы Беларусі ў Эўропе” выступіў кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Уладзімер Макей. Раней беларускія службовыя асобы такога высокага рангу не наведвалі гэты форум, у арганізацыі якога традыцыйна бярэ актыўны ўдзел нямецкі бок.

“Беларусь робіць унёсак у эўрапейскую бясьпеку і не стварае ніякіх праблемаў, — зазначыў У. Макей. — Мы зацікаўленыя ў разьвіцьці супрацы з Эўрапейскім Зьвязам”.


photo.bymedia.net

Разам з тым, на думку назіральнікаў, з выступу чыноўніка вынікае, што беларуская ўлада хоча весьці дыялёг з Эўропай на сваіх умовах, ня робячы значных саступак

у галінах дэмакратызацыі, забесьпячэньня грамадзянскіх свабодаў ды правоў чалавека.

Так, кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта адзначыў, што цягам многіх гадоў Беларусь “абсалютна незаслужана знаходзілася пад эканамічным і палітычным прэсінгам”, але ўрэшце ў Эўропе зразумелі, што гэта “несправядліва і контрпрадукцыйна”. Са слоў У. Макея, нельга патрабаваць, каб усюды ўкараняўся “пад капірку” менавіта заходні варыянт дэмакратыі, бо ў кожнага народу свае традыцыі ды мэнтальнасьць.

Экспэрты робяць выснову, што Менск разьлічвае на “прагматычную супрацу”, то бок атрыманьне фінансавых, эканамічных выгадаў ад пацяпленьня адносінаў з Захадам без трансфармацыі аўтарытарнай палітычнай сыстэмы Беларусі. Магчымыя хіба што касмэтычныя зьмены. Так, ня выключана, што шэраг недзяржаўных выданьняў могуць быць вернутыя ў нацыянальную сыстэму распаўсюду.

ПАЛІТЫКА

## Сорас прапануе даць Лукашэнку шанец

***“Аляксандру Лукашэнку трэба даць магчымасьць прадэманстраваць жаданьне ня толькі зьмяніць адносіны з Эўропай, але і ўрэгуляваць унутраную сытуацыю”, — лічыць старшыня інстытуту “Адкрытае грамадзтва” Джордж Сорас.***



Пра гэта ён заявіў, выступаючы на XIII Форуме адкрытага грамадзтва, які прайшоў 6–7 лістапада ў Таліне, паведамляе БелаПАН.

Джордж Сорас таксама зазначыў, што становішча было б расцэнена вяртаньне Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў Беларусь, таму што студэнты гэтага ўнівэрсытэту хочуць вучыцца ў сваёй краіне.

АФІЦЫЙНА

## Справу Пісальніка пакінулі без разгляду

***Суд Кастрычніцкага раёну Горадні пакінуў без разгляду справу пра экстрэмісцкі зьмест нумару газэты “Глос з-над Немна ў выгнаньні”, ініцыятарам якой выступаў кіраўнік упраўленьня КДБ па Гарадзенскай вобласьці Ігар Сяргеенка.***

Кіраўнік упраўленьня КДБ па Гарадзенскай вобласьці генэрал-маёр Ігар Сяргеенка прасіў суд прызнаць нумар газэты, канфіскаваны ў свой час гарадзенскімі мытнікамі ў Анджэя Пісальніка, экстрэмісцкім і вынесьці рашэньне пра яго зьнішчэньне.

Суд прапанову шэфа мясцовага КДБ адхіліў: судзьдзя Аляксандар Сіцько спаслаўся на адпаведны артыкул Грамадзянска-працэсуальнага кодэксу, які дае права пакінуць справу без разгляду.

АПАЗЫЦЫЯ

## Эўрапейская кааліцыя хоча зьменаў у АДС

***Эўрапейская кааліцыя настойвае на фармаваньні новага супрацоўніцтва ў рамках Аб’яднаных дэмакратычных сілаў. Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч, партыя якога зьяўляецца чальцом Эўрапейскай кааліцыі, лічыць, што дамова аб стварэньні АДС страціла сваю актуальнасьць і яе неабходна абнавіць.***



photo.bymedia.net

Канфлікт паміж Эўрапейскай кааліцыяй і лідэрамі АДС трывае здаўна й час ад часу прыцягвае на сябе ўвагу мэдыяў. Чальцы кааліцыі лічаць, што іх, як заснавальнікаў АДС, няслушна адсунулі ад працы ў структурах. У сваю чаргу дэмакратычныя лідэры мяркуюць, што, у прыватнасьці,

партыя Міколы Статкевіча не праяўляла зацікаўленьня працаю ў Аб'яднаных дэмакратычных сілах. Нельга выказвацца пра працу, удзел у якой не прымаўся.

У інтэрвію "Беларускаму партызану" Мікола Статкевіч заявіў, што Эўрапейская кааліцыя выказваецца за супрацоўніцтва. "Аднак мы хочам, каб гэта была менавіта супраца, а ня ціск адных сілаў на іншыя".

ЭКАНОМІКА

## Латвія — за Беларусь

*12 лістапада, па запрашэньні латыскага боку, з рабочым візытам у Рыгу прыбыў прэм'ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі, паведамляе прэсавая служба старшыні Рады міністраў.*

"Латвія будзе падтрымліваць Беларусь у пытаньнях паляпшэньня адносінаў з ЭЗ", — заявіў сёньня прэм'ер-міністар Латвіі Іварс Годманіс. Паводле ягоных словаў, гэтае пытаньне знаходзіцца ў праграме дня Эўрапейскага Зьвязу. "Беларусь падтрымлівае ня толькі Латвія, але й іншыя краіны. Так што тут адказ станоўчы", — зазначыў Іварс Годманіс.

Сёньня прэм'ер Сяргей Сідорскі са сваім латыскім калегам Іварсам Годманісам прымуць удзел у цырымоніі адкрыцьця Нацыянальнай выставы Рэспублікі Беларусь у Латыскай Рэспубліцы "Беларусь-ЭКСПА 2008". У рамках візыту заплянаваныя перамовы прэм'ераў адзін на адзін, а таксама ў пашыраным складзе, а апроч таго падпісаньне шэрагу беларуска-латыскіх міжведамасных пагадненьняў ды сустрэча зь бізнэс-коламі Беларусі й Латвіі.

ГРАМАДЗТВА

## На XI Менскім форуме прагучыць тэма свабоды СМІ

*З 13 лістапада ў Менску пачынае працу XI Менскі форум, традыцыйна прысьвечаны пытаньням эканомікі, палітыкі, культуры й гісторыі, паведамляе прэсавая служба ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў".*

Паводле назіральнікаў, сёлетні форум выклікае цікавасьць нават складам удзельнікаў. Напрыклад, як заўважаюць naviny.by, упершыню афіцыйны Менск будзе



photo.bymedia.net

прадстаўлены на ім на ўзроўні прэзыдэнцкай адміністрацыі. Чакаецца прыезд больш за 300 гасьцей з розных краін Эўропы.

Тэма сёлетняга форуму — "Суседзтва і бясьпека: пэрспэктывы Беларусі ў Эўропе". На сустрэчы будуць абмяркоўвацца эўрапейскія пэрспэктывы Беларусі, удзел нашай краіны ў эўрапейскай палітыцы добрасуседзтва, магчымасьці інвэстыцый у беларускую эканоміку і г.д.

На 14 лістапада ў праграме Менскага форуму заплянаваны "круглы стол" на тэму "Інфармацыйная прастора Беларусі".

КУЛЬТУРА

## Ахова гісторыка-культурнай спадчыны па-слуцку

*Пракуратура Менскай вобласьці выявіла шэраг фактаў парушэньня Закону "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" у Слуцкім раёне, паведамляе "Польскае радыё".*

У прыватнасьці, падчас праверкі было выяўлена, што не прадпрымаецца неабходных мераў па захаваньні помніка архітэктуры — гарадзішча раньняга жалезнага веку, уключанага ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў Рэспублікі Беларусь па Слуцкім раёне. На тэрыторыі помніка былі выяўленыя вогнішчы, якія сьведчаць пра тое, што яно зьяўляецца месцам пастаяннага адпачынку грамадзянаў.

Складаная сытуацыя была зафіксаваная на тэрыторыі былога маёнтку Дамансікх, непадалёк ад вёскі Залядзьдзе. Рэшткі будынкаў XVIII ст. былі засьмечаныя будматэрыяламі й паваленымі дрэвамі. Тэрыторыя сядзібы цалкам зарасла дрэвамі й кустамі. У комплексе Слуцкай паштовай станцыі, зь сярэдзіны XIX ст., праводзяцца рамонтна-будаўнічыя працы, якія супярэчаць патрабаваньням Закону "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь".

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap.
The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.